Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар БДУКМ
________________ Ю. П. Бондар
«_____»_______________ 2015 г.
Рэгістрацыйны № ВД-___/вуч.

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ФАЛЬКЛАРЫСТЫКІ

*Вучэбная праграма*
*ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне*
*для спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць*
*(па напрамках), напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-05*
*Народная творчасць (фальклор),*
*спецыялізацыі 1-18 01 01-05 01 Этнафоназнаўства*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск
БДУКМ
2015

**СКЛАДАЛЬНІК**

*А. А. Гулак,* старшы выкладчык кафедры этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат філалагічных навук

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*Т. В. Валодзіна,* загадчык аддзела фалькларыстыкі і культуры славянскіх народаў дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі» філіяла «Інстытут мастацтвазнаўства, этналогіі і фальклору імя Кандрата Крапівы», доктар філалагічных навук;
*А. М. Нароўская,* дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 10 ад 14.05.2015);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 6 ад 18.06.2015)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: А. А. Гулак

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Гісторыя беларускай фалькларыстыкі» садзейнічае глыбокаму засваенню студэнтамі комплексу тэарэтычных і практычных ведаў у галіне фалькларыстыкі. Яна дазваляе сістэматызаваць уяўленні пра здабыткі, назапашаныя навукай на працягу яе гістарычнага развіцця, асэнсаваць асноўныя кірункі збірання, публікацыі і даследавання вуснапаэтычнай творчасці ў працах айчынных і замежных вучоных, сфарміраваць уяўленне пра найбольш значныя крыніцы і тэарэтычныя працы па фалькларыстыцы.

Выкладанне гісторыі беларускай фалькларыстыкі базіруецца на ведах, атрыманых студэнтамі пры вывучэнні цыкла спецыяльных вучэбных дысцыплін («Этнаграфія», «Міфалогія», «Этнасеміётыка»). Гэта дае магчымасць сістэмнага засваення і комплекснага ўсведамлення працэсу развіцця навукі аб фальклоры.

*Мэта* вучэбнай дысцыпліны: фарміраванне ў будучага спецыяліста ў галіне беларускай народнай культуры ведаў пра ўзнікненне, станаўленне і развіццё навукі аб фальклоры, спецыфіку яго збірання і вывучэння на розных этапах; практычнае азнаямленне студэнтаў са спадчынай буйных даследчыкаў народнай творчасці і іх канцэптуальнымі здабыткамі.

*Задачы* вучэбнай дысцыпліны:

– тэарэтычнае і практычнае азнаямленне студэнтаў з помнікамі фалькларыстыкі XIX–XX стст.;

– засваенне студэнтамі асноўных паняццяў і тэрмінаў фалькларыстычнай навукі, канцэпцый асноўных школ і кірункаў фалькларыстыкі, метадаў фалькларыстычнага даследавання;

– фарміраванне асновы даследчыцкай культуры студэнта, базы для развіцця і эфектыўнага прымянення даследчыцкіх навыкаў будучага спецыяліста ў галіне беларускай народнай культуры.

У выніку засваення вучэбнай дысцыпліны студэнты павінны *ведаць*:

– агульнатэарэтычныя пытанні фалькларыстыкі, сацыяльныя і гісторыка-культурныя перадумовы ўзнікнення навукі аб фальклоры, ролю навуковых і грамадскіх устаноў, пэўных асоб у яе станаўленні;

– этапы развіцця беларускай фалькларыстыкі, асноўных прадстаўнікоў і іх працы;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– характар фіксацыі і публікацыі фальклорных тэкстаў у розныя перыяды развіцця навукі і сучасную практыку ў гэтай сферы;

– асаблівасці тэарэтычнага асэнсавання вусна-паэтычнай творчасці беларускага народа ў XIX–XX стст. і сучасныя праблемы фалькларыстыкі.

У выніку засваення вучэбнай дысцыпліны студэнты павінны *ўмець:*

– характарызаваць фалькларыстычныя школы і напрамкі;

– аналізаваць з'явы традыцыйнай духоўнай культуры і фальклорна-этнаграфічныя зборнікі з улікам набытых ведаў;

– карыстацца навуковай і даведачнай літаратурай па пытаннях гісторыі фалькларыстыкі і звязаных з ёй вучэбных дысцыплін.

У выніку вывучэння дысцыпліны «Гісторыя беларускай фалькларыстыкі» студэнты павінны *валодаць* здольнасцю прымяняць атрыманыя веды ў кантэксце сваёй прафесійнай дзейнасці; сістэматызаваць і абагульняць фальклорныя матэрыялы: творы розных жанраў, гістарычных перыядаў і субкультур.

Да найбольш эфектыўных тэхналогій і метадаў навучання студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя беларускай фалькларыстыкі» належаць:

– тэхналогія блочна-модульнага навучання;

– тэхналогіі інфармацыйна-камп'ютарнага навучання;

– тэхналогіі вучэбна-даследчыцкай дзейнасці;

– рэпрадукцыйныя метады (лекцыя, тлумачэнне, дыскусія, дэманстрацыя відэа- і аўдыязапісаў);

– метады самастойнай работы студэнтаў (работа з першакрыніцамі ў фондах бібліятэк);

– кантрольна-ацэначныя метады.

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў прадугледжвае вывучэнне асобных тэм і раздзелаў вучэбнай дысцыпліны з выкарыстаннем метадычных рекамендацый і літаратуры, рэкамендаванай выкладчыкам. Кантроль самастойнай работы студэнтаў адбываецца перыядычна падчас аўдыторных заняткаў.

У адпаведнасці з вучэбным планам на засваенне вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя беларускай фалькларыстыкі» адведзена ўсяго 202 гадзіны, з якіх 102 – аўдыторныя заняткі (90 гадзін – лекцыі, 12 гадзін – семінарскія). Рэкамендуемая форма кантролю ведаў – залік і экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Усяго | Лекцыі | Семінары |
|---|---|---|---|
| Уводзіны | 2 | 2 | |
| **Раздзел I. Перадумовы ўзнікнення навукі аб фальклоры** | | | |
| *Тэма 1.* Помнікі старажытнай літаратуры як крыніца народазнаўчага даследавання | 2 | 2 | |
| *Тэма 2.* Гістарычна-мемуарная літаратура як крыніца народазнаўчага даследавання | 2 | 2 | |
| *Тэма 3.* Традыцыйная культура ў творах пісьменнікаў-лацiністаў і ў краязнаўчай літаратуры XVI–XVII стст. | 2 | 2 | |
| *Тэма 4.* С. Рысінскі – першы даследчык беларускай парэміялогіі | 2 | 2 | |
| **Раздзел II. Развіццё народазнаўства ў канцы XVIII – пачатку XIX ст.** | | | |
| *Тэма 5.* Пачатак сістэматычнай збіральніцкай і даследчай працы | 2 | 2 | |
| *Тэма 6.* Навуковая спадчына заснавальніка славяназнаўства З. Даленгі-Хадакоўскага (1784–1825) | 2 | 2 | |
| *Тэма 7.* Віленскі ўніверсітэт як цэнтр навукі і прагрэсіўнай грамадскай думкі | 2 | 2 | |
| *Тэма 8.* Творчы шлях Я. Чачота (1796–1847). Зборнік «Вясковыя песні з-над Нёмана і Дзвіны» (1837–1846) | 2 | 2 | |
| *Тэма 9.* Народазнаўчая спадчына У. Сыракомлі (1823–1862) і Ю. Крашэўскага (1812–1887) | 2 | 2 | |
| *Тэма 10.* Даследаванні беларускай міфалогіі П.М. Шпілеўскага (1823–1861) | 2 | 2 | |
| **Раздзел III. Даследаванне народнай культуры ў 50–70-я гг. XIX ст.** | | | |
| *Тэма 11.* Я. Баршчэўскі (1794–1851): «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» (1840–1844) | 2 | 2 | |
| *Тэма 12.* Дзейнасць Я. Тышкевіча (1814–1873). «Апісанне Барысаўскага павета» (1847) | 4 | 2 | 2 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | |
|---|---|---|---|
| *Тэма 13.* Тэндэнцыі развіцця навукі аб фальклоры ў другой палове XIX ст. | 2 | 2 | |
| *Тэма 14.* Дзейнасць РГТ. Праграма для збору этнаграфічна-фальклорных матэрыялаў | 2 | 2 | |
| *Тэма 15.* А. Кіркор (1818–1886) – даследчык народнай культуры. «Маляўнічая Расія» (Т. III) (1882) | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 16.* Народазнаўчая дзейнасць П. В. Шэйна (1826–1900). Праграма збірання вуснай народнай творчасці (1867) | 2 | 2 | |
| *Тэма 17.* Навуковая спадчына І. І. Насовіча (1788–1877) | 2 | 2 | |
| *Тэма 18.* П.А. Бяссонаў (1828–1898) – даследчык беларускага абрадавага фальклору | 2 | 2 | |
| **Раздзел IV. Здабыткі беларускай фальклярыстыкі 80–90-х гг. XIX ст.** | | | |
| *Тэма 19.* Школы і кірункі даследаванняў у фальклярыстыцы канца XIX ст. | 2 | 2 | |
| *Тэма 20.* Даследчык народнай культуры Е.Р. Раманаў (1855–1922). «Беларускі зборнік» (1886–1928) | 4 | 4 | |
| *Тэма 21.* Навуковая спадчына М. Федароўскага (1853–1923). «Люд беларускі» (1891–1981) | 2 | 2 | |
| *Тэма 22.* Фальклярыстычная дзейнасць У. М. Дабравольскага (1856–1920). «Смаленскі этнаграфічны зборнік» (1891–1903) | 2 | 2 | |
| *Тэма 23.* Навуковая спадчына М. Я. Нікіфароўскага (1845–1910) | 4 | 4 | |
| *Тэма 24.* Даследчык усходнеславянскай культуры М.А. Янчук (1859–1921) | 2 | 2 | |
| *Тэма 25.* Жыццёвы шлях і дзейнасць М. В. Доўнар-Запольскага (1867–1934) | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 26.* Фальклорна-этнаграфічныя працы А. К. Сержпутоўскага (1864–1940) | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 27.* Народазнаўчая дзейнасць Я. А. Ляцкага (1868–1942) | 2 | 2 | |
| *Тэма 28.* Фальклярыстычная спадчына А. Я. Багдановіча (1860–1940) | 2 | 2 | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | |
|---|---|---|---|
| *Тэма 29.* Жыццёвы шлях Я.Ф. Карскага (1861–1931). Шматтомная праца «Беларусы» (1903–1922) | 4 | 4 | |
| *Тэма 30.* Ч. Пяткевіч (1856–1936 ) – даследчык традыцыйнай культуры Беларускага Палесся | 2 | 2 | |
| *Тэма 31.* К. Машынскі (1887–1959): унёсак у развіццё славяназнаўства | 2 | 2 | |
| **Раздзел V. Беларуская фалькларыстыка ў XX–XXI стст.** | | | |
| *Тэма 32.* Фальклорна-этнаграфічная праца ў Беларусі ў 1920-я гг. | 2 | 2 | |
| *Тэма 33.* Беларуская фалькларыстыка 1930–50-х гг.: уплыў савецкай ідэалогіі | 4 | 4 | |
| *Тэма 34.* Збіранне і вывучэнне народнай песні беларускімі савецкімі кампазітарамі | 2 | 2 | |
| *Тэма 35.* Дзейнасць ІМЭФ АН БССР. Серыя «Беларуская народная творчасць» (БНТ) | 2 | 2 | |
| *Тэма 36.* Развіццё беларускай этнамузыкалогіі | 2 | 2 | |
| *Тэма 37.* Спадчына славутых збіральнікаў у даследаваннях беларускіх навукоўцаў | 6 | 4 | 2 |
| *Тэма 38.* Беларуская фалькларыстыка на сучасным этапе | 6 | 4 | 2 |
| **Разам…** | **102** | **90** | **12** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## *Уводзіны*

Асноўныя паняцці: гісторыя навукі, гістарыяграфія, традыцыйная культура, эдыцыя, тэксталогія, навуковая школа, навуковы кірунак. Развіццё навуковых даследаванняў народнай творчасці як прадмет гісторыі фалькларыстыкі. Перыядызацыя. Асноўныя напрамкі сучаснай фалькларыстыкі: антрапалагічны, этналінгвістычны, этнасеміятычны, этнамузыказнаўчы, гісторыка-сацыялагічны. Даследаванне збірання, выдання і тэарэтычнага асэнсавання ўзораў фальклору, выяўленне гістарычных заканамернасцей развіцця навукі аб фальклоры, вывучэнне ўнёску асобных даследчыкаў і навуковых школ у развіццё і станаўленне навукі аб фальклоры.

## Раздзел І. Перадумовы ўзнікнення навукі аб фальклоры

### *Тэма 1. Помнікі старажытнай літаратуры як крыніца народазнаўчага даследавання*

Першыя звесткі пра духоўную культуру ўсходніх славян у старажытнай літаратуры: «Жыціі Еўфрасінні Полацкай», словах, малітвах і прыпавесцях Кірылы Тураўскага. Фальклорна-паэтычныя матэрыялы ў старажытнарускім летапісным зводзе пач. XII ст. «Аповесць мінулых гадоў». Дакументальныя звесткі з гісторыі славян, апісанні культаў, каляндарных і сямейных абрадаў у творах германскіх і польскіх храністаў. Народная творчасць у літаратуры эпохі Адраджэння. Стыхія народнай творчасці ў прадмовах і пасляслоўях Ф. Скарыны.

### *Тэма 2. Гістарычна-мемуарная літаратура як крыніца народазнаўчага даследавання*

Фальклор у летапісах, водпісах, дыярыушах і іншых старажытных матэрыялах і дакументах. Народная парэміялогія і фальклорная паэтыка ў помніках гістарычна-мемуарнай літаратуры: «Дзённік люблінскага сейма 1569 года», «Лісты» Ф. Кміты-Чарнабыльскага, «Дзённік» Ф. Еўлашэўскага.

Вялікія геаграфічныя адкрыцці XV–XVII стст. як фактар узнікнення і развіцця гістарычна-мемуарнай літаратуры XVI–XVII стст. Апісанні падарожжаў у Вялікае Княства Літоўскае і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Маскоўскую дзяржаву (*Масковію*) Мацея Мяхоўскага, Рафаэле Барберыні, Ганса Кабенцля фон Просега і інш. «Запіскі аб Масковіі» Сігізмунда Герберштэйна (XVI ст.), раздзел «Аб Літве», прысвечаны Беларусі. Каштоўныя звесткі пра жыццё, побыт, народную культуру насельніцтва Усходняй Еўропы, у тым ліку Беларусі.

*Тэма 3. Традыцыйная культура ў творах пісьменнікаў-лацііністаў і ў краязнаўчай літаратуры XVI–XVII стст.*

Гістарычная лацінамоўная паэма «Пруская вайна» (1515) Яна Вісліцкага ў кантэксце адлюстравання народнай культуры. Ліра-эпічная лацінамоўная паэма «Песня пра зубра» (1522) Міколы Гусоўскага: прырода, гісторыя і звычаі беларусаў. Дзейнасць аднаго з найбольш значных пісьменнікаў-краязнаўцаў другой паловы XVI – першай паловы XVII ст. Яна Ласіцкага. Твор Я. Ласіцкага «Пра рэлігію, ахвярапрынашэнні, вясельныя, пахавальныя абрады русінаў, маскавітаў, татар» (1582). Шлюбныя звычаі і абрады «русінаў» у апісаннях Я. Ласіцкага.

*Тэма 4. С. Рысінскі – першы даследчык беларускай парэміялогіі*

Жыццёвы шлях Саламона Рысінскага – першага даследчыка беларускай парэміялогіі. Прыхільныя адносіны С. Рысінскага да народнай культуры, творчасці сялянства. Зборнік «Тысяча васямсот польскіх прыказак» (1618). Сістэматызацыя тэкстаў са зборніка, іншамоўныя паралелі. Культурная каштоўнасць парэмій, значэнне для тагачаснай навукі і народнай асветы. Вялікі ўплыў працы С. Рысінскага на далейшае развіццё парэміяграфіі ў Рэчы Паспалітай, а пазней і ў Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Раздзел II. Развіццё народазнаўства ў канцы XVIII – пачатку XIX ст.

*Тэма 5. Пачатак сістэматычнай збіральніцкай і даследчай працы*

Самабытная творчасць народа, яго гістарычная мінуўшчына, увасобленая ў матэрыяльнай і духоўнай культуры, набываюць асаблівую актуальнасць пасля падзелаў Рэчы Паспалітай (1772, 1793, 1795). Страта польскай дзяржаўнасці як імпульс росту

патрыятызму сярод палякаў і сярод інтэлігенцыі «ўсходніх крэсаў». Распрацоўка пытанняў этнагенезу, гісторыі славянства ранніх вякоў. Першыя даследчыкі ў Беларусі XVIII ст.: А. Нарушэвіч, Ю. Нямцэвіч, Я. Патоцкі, С. Богуш-Сестранцэвіч, Г. Калантай. Асэнсаванне гістарычнага развіцця беларусаў, іх культуры. Праграма вывучэння матэрыяльнай і духоўнай культуры народа Г. Калантая. Дзейнасць Варшаўскага таварыства сяброў навук у галіне народазнаўства.

*Тэма 6. Навуковая спадчына заснавальніка славяназнаўства З. Даленгі-Хадакоўскага (1784–1825)*

З. Даленга-Хадакоўскі – піянер славяназнаўства, збіральнік і даследчык беларускага, рускага, украінскага, польскага фальклору. Жыццёвы шлях у кантэксце гістарычнай эпохі. Праграма комплекснага вывучэння культуры славян З. Даленгі-Хадакоўскага. Наватарства яго як фалькларыста і этнографа: адмова ад кабінетнай навукі, збор матэрыялаў у палявых умовах. Значэнне міфалогіі для асэнсавання традыцыйнай культуры славян. Лёс унікальных архіваў З. Даленгі-Хадакоўскага.

*Тэма 7. Віленскі ўніверсітэт як цэнтр навукі і прагрэсіўнай грамадскай думкі*

Віленскі ўніверсітэт – старэйшая навучальная ўстанова былога Вялікага Княства Літоўскага. Навуковая дзейнасць Віленскага ўніверсітэта. Найважнейшая задача – пашырэнне асветы на ўсю тэрыторыю Беларусі і Літвы. Перыяд росквіту ўніверсітэта да паўстання 1830–1831 гг. Тайныя патрыятычныя таварыствы філаматаў (1817) і філарэтаў (1820–1823), створаныя студэнтамі Віленскага ўніверсітэта (А. Міцкевіч, Т. Зан, Я. Чачот і інш.). Праблемы народнай культуры як праявы ўсяго нацыянальнага ў дзейнасці Віленскага ўніверсітэта. Умовы для збірання і вывучэння помнікаў фальклору і этнаграфіі ў пачатку XIX ст.

*Тэма 8. Творчы шлях Я. Чачота (1796–1847). Зборнік «Вясковыя песні з-над Нёмана і Дзвіны» (1837–1846)*

Жыццёвы шлях Яна Чачота. Уплыў на яго погляды і творчасць гуманістычных і патрыятычных ідэй філаматаў. Паэт-фалькларыст Ян Чачот як збіральнік аўтэнтычных беларускіх народных песень. Зборнікі «Вясковыя песні з-над Нёмана і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дзвіны» (1837, 1839, 1844, 1845, 1846). Асветніцкія задачы ўкладальніка. Ідэалістычна-рамантычная трактоўка беларускага фальклору.

*Тэма 9. Народазнаўчая спадчына У. Сыракомлі (1823–1862) і Ю. Крашэўскага (1812–1887)*

Жыццёвы шлях Уладзіслава Сыракомлі. Пераклады паэтаўлацiністаў, двухтомнай «Гісторыі літаратуры ў Польшчы», зборнікаў лірычных твораў. Падтрымка творчасці літаратараў на беларускай мове (В. Дунін-Марцінкевіч, А. Вярыга-Дарэўскі і інш.). Зварот у паэтычнай творчасці да фальклору, арыентацыя на народніцкія дэмакратычныя каштоўнасці.

Дзейнасць Юзафа Крашэўскага – гісторыка, пісьменнніка, грамадскага дзеяча. Навукова-публіцыстычныя працы: «Старажытная Літва. Яе гісторыя, законы, мова, вера, звычаі, песні...» (1847–50), «Барысаў» (1848) і інш. Апісанне падарожжа па Беларусі ў нарысах «Пінск і Піншчына» (1837), «Успаміны Валыні, Палесся і Літвы» (1840), «Малюнкі з жыцця і падарожжаў» (1842), «Адзенне сялян і мяшчан з ваколіц Брэста, Кобрына і Пружан» (1859–60). Тыпы беларускіх сялян, традыцыйная культура ў творах Крашэўскага.

*Тэма 10. Даследаванні беларускай міфалогіі П. Шпілеўскага (1823–1861)*

Жыццё і дзейнасць літаратара і фалькларыста Паўла Шпілеўскага. Цыкл нарысаў пра славянскія старажытнасці: «Беларускія народныя паданні» (Ч. 1, 1846; Ч. 2–3, 1852). Міфалагічна-фальклорная тэматыка нарыса «Даследаванне пра ваўкалакаў на аснове беларускіх павер'яў» (1853). Белетрызаваныя апісанні з'яў традыцыйнай культуры беларусаў. Фактычныя недакладнасці і памылковыя інтэрпрэтацыі фактаў традыцыйнай культуры. Ацэнка нарысаў П. Шпілеўскага па славянскай міфалогіі з пазіцый сучаснай навукі. Засваенне спадчыны даследчыка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел III. Даследаванне народнай культуры ў 50–70-я гг. XIX ст.

*Тэма 11. Я. Баршчэўскі (1794–1851): «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» (1840–1844)*

Літаратурна-публіцыстычная дзейнасць Яна Баршчэўскага. Празаічны зборнік «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» (Т. 1–4, 1840–1844, на польскай мове). Апісанне побыту і духоўнай культуры беларускага селяніна, партрэты прадстаўнікоў розных сацыяльных груп. Народныя легенды, міфалагічныя паданні і павер'і пра нячыстую сілу як аснова сюжэта цыкла «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях». Рамантычна-ўзнёслае пачуццё любові да роднага краю ў творы Я. Баршчэўскага.

*Тэма 12. Дзейнасць Я. Тышкевіча (1814 –1873). «Апісанне Барысаўскага павета» (1847)*

Я. Тышкевіч – славуты археолаг, краязнаўца, грамадскі дзеяч, даследчык народнай культуры. Захапленне старажытнай гісторыяй, археалогіяй і фальклорам. Вывучэнне пахавальнай абраднасці славян, краязнаўчыя даследаванні на Лагойшчыне. Праца над даследаваннем «Апісанне Барысаўскага павета» (1847). Шырокае кола першакрыніц, грунтоўныя апісанні многіх з'яў абрадавай культуры, побыту і працоўных працэсаў беларускага сялянства ў «Апісанні Барысаўскага павета».

*Тэма 13. Тэндэнцыі развіцця навукі аб фальклоры ў другой палове XIX ст.*

Пачатак 1850-х гг. у гісторыі вывучэння беларускага фальклору: складаюцца ўмовы для ўзнікнення фалькларыстыкі як асобнай, самастойнай філалагічнай навукі. Навука аб народнай творчасці перастае быць з'явай аматарскай і стыхійнай. Фальклорна-этнаграфічны рух каардынуе РГТ. Развіццё збіральніцкай практыкі, удасканаленне прынцыпаў публікацыі народных твораў. Развіваецца міфалагічная школа – кірунак у беларускай фалькларыстыцы (1840–1870). Канцэпцыя пра міф як аснову духоўнай культуры беларусаў. Інтэрпрэтацыя даследчыкамі міфалагічнай школы на беларускім матэрыяле канцэптуальных ідэй нямецкай і рускай міфалагічнай школы як фактар узнікнення новых ідэй генезісу і семантыкі беларускага фальклору.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 14. Дзейнасць РГТ. Праграма для збору этнаграфічна-фальклорных матэрыялаў*

Сацыяльныя ўмовы развіцця беларускай фалькларыстыкі 1860-х гг. Навуковая дзейнасць Рускага геаграфічнага таварыства: пачатак прафесійнага фальклорна-этнаграфічнага даследавання Беларусі. Публікацыя на старонках перыядычных выданняў РГТ класічных даследаванняў па беларускім фальклоры. Праграма для збору этнаграфічна-фальклорных матэрыялаў (1847). Стварэнне ў 1866 г. Паўночна-Заходняга аддзела РГТ. Мэтанакіраваны характар дзейнасці гэтай установы ў галіне вывучэння беларускага народа і яго сацыяльна-культурнага становішча.

*Тэма 15. А. Кіркор (1818–1886) – даследчык народнай культуры. «Маляўнічая Расія» (Т. ІІІ) (1882)*

Шматграннасць асобы Адама Кіркора: грамадскі дзеяч, этнограф, публіцыст, выдавец, гісторык, краязнавец, археолаг. Першае навуковае апісанне матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў – «Этнаграфічны погляд на Віленскую губерню» (1857–1859). Беларускія тапанімічныя паданні гістарычнага зместу, звязаныя з курганамі дахрысціянскага часу, з крыжацкімі, татарскімі, шведскімі, французскімі пахаваннямі. Публікацыя многіх сюжэтаў гэтых паданняў разам з арыгінальнымі краязнаўчымі і археалагічнымі звесткамі робяць працу А. Кіркора «Этнаграфічны погляд на Віленскую губерню» непераўзыдзенай па багацці матэрыялу. Уключэнне яе ў том аўтарытэтнага шматтомнага выдання «Маляўнічая Расія». Рэпрынтнае выданне 1994 г.

*Тэма 16. Народазнаўчая дзейнасць П. В. Шэйна (1826–1900). Праграма збірання вуснай народнай творчасці (1867)*

Павел Васільевіч Шэйн як збіральнік беларускай народнай вусна-паэтычнай творчасці, арганізатар сеткі карэспандэнтаў, укладальнік фалькларыстычнага зборніка «Беларускія песні» (1871) – самай буйной працы сярод аналагічных зборнікаў 1860–1870-х гг. Стварэнне П. Шэйнам праграмы па збіранні вуснай народнай творчасці. Арыентацыя на архаіку, практыка запісвання фальклорных твораў. «Матэрыялы для вывучэння побыту і мовы рускага насельніцтва Паўночна-Заходняга краю» (1887–1893).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 17. Навуковая спадчына І. І. Насовіча (1788 –1877)*

Іван Насовіч – беларускі мовазнавец-лексікограф, фальклaрыст і этнограф. Ранняе захапленне мовазнаўствам, супрацоўніцтва з Акадэміяй навук у Санкт-Пецярбургу. І. Насовіч – укладальнік першага гістарычнага слоўніка беларускай мовы. «Зборнік беларускіх прыказак» (1866). Багацце парэміялагічных твораў, недахопы сістэматызацыі. Значэнне зборніка І. Насовіча ў фальклaрыстыцы ўсходніх славян. Асноўная лінгвістычная праца І. І. Насовіча – тлумачальна-перакладны «Слоўнік беларускай гаворкі» (1870).

*Тэма 18. П.А. Бяссонаў (1828–1898) – даследчык беларускага абрадавага фальклору*

Пётр Бяссонаў – славянафіл, фальклaрыст, філолаг, публікатар славянскага фальклору. Сацыяльныя погляды. Тэарэтычнае асэнсаванне ўзораў беларускай каляндарна-абрадавай творчасці ў зборніку «Беларускія песні» (1871). Аналіз вясновалетняга цыкла беларускай вусна-паэтычнай творчасці: выяўленне генетычнай еднасці абраднасці вясновага і летняга цыкла, выяўленне славянскіх міфапаэтычных і абрадавых паралелей. Устаноўка на архаіку і міфалогію ў інтэрпрэтацыях П. Бяссонава.

## Раздзел IV. Здабыткі беларускай фальклaрыстыкі 80–90-х гг. XIX ст.

*Тэма 19. Школы і кірункі даследаванняў у фальклaрыстыцы канца XIX ст.*

Пераасэнсаванне і пераадоленне ідэй і метадалагічных падыходаў міфалагічнай школы ва ўсходнеславянскай і беларускай фальклaрыстыцы 80–90-х гг. XIX ст. Развіццё ідэй культурна-гістарычнай і антрапалагічнай (этнаграфічнай) школы ў кантэксце вывучэння духоўнай і матэрыяльнай культуры беларусаў.

*Тэма 20. Даследчык народнай культуры Е.Р. Раманаў (1855–1922). «Беларускі зборнік» (1886–1928)*

Еўдакім Раманаў – славуты беларускі этнограф, фальклaрыст і археолаг. Унёсак у беларускую фальклaрыстыку і этна-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

графію, лінгвістыку і археалогію. «Беларускі зборнік» – энцыклапедыя побыту, творчасці, матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускага народа XIX – пач. XX ст. Значэнне для навукі: багацце фактычнага матэрыялу, публікацыя ўласных экспедыцыйных матэрыялаў. Е. Раманаў – наватар методыкі збірання і сістэматызацыі фальклору. Значэнне трэцяга выпуску «Беларускага зборніка» ў гісторыі фалькларыстыкі: першае асобнае выданне беларускіх народных казак.

### *Тэма 21. Навуковая спадчына М. Федароўскага (1853–1923). «Люд беларускі» (1891–1981)*

Выдатны збіральнік і даследчык беларускіх народных твораў Міхал Федароўскі – адзін з буйнейшых народазнаўцаў. Жыццёвы шлях: дзейнасць у Беларусі. Восем тамоў «Люду беларускага» – вялізны ахоп фальклорна-этнаграфічнага матэрыялу. Прызнанне выдання ў славянскім навуковым свеце. Федароўскі і «Наша ніва». Лёс ненадрукаваных рукапісаў Федароўскага.

### *Тэма 22. Фалькларыстычная дзейнасць У. М. Дабравольскага (1856–1920). «Смаленскі этнаграфічны зборнік» (1891–1903)*

Жыццёвы шлях Уладзіміра Дабравольскага. Самая значная праца – чатырохтомны «Смаленскі этнаграфічны зборнік». Першая частка (1891) уключае празаічныя жанры, сярод якіх упершыню друкуюцца ўспаміны (мемараты). Захаванне асаблівасцей мовы інфарматараў. Другая частка зборніка (1893) – сямейна-абрадавая паэзія, трэцяя (1894) – парэміі, чацвёртая (1903) – апісанні ігрышчаў, каляндарна-абрадавыя песні, дзіцячыя, пазаабрадавыя, гістарычныя песні, духоўныя вершы. Матэрыял для кампаратывісцкага вывучэння культуры рускіх і беларусаў.

### *Тэма 23. Навуковая спадчына М. Я. Нікіфароўскага (1845–1910)*

Мікалай Якаўлевіч Нікіфароўскі – выдатны збіральнік і даследчык традыцыйнай культуры Віцебшчыны, складальнік змястоўных зборнікаў фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў. «Прастанародныя прыкметы і павер’і...» (1897), «Нячысцікі. Збор прастанародных у Віцебскай Беларусі паданняў пра нячыстую сілу» (1907) – белетрызаваныя нарысы па славян-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

скай дэманалогіі. «Беларускія песні-частушкі» (1911) – першы зборнік беларускіх прыпевак, наватарская з'ява ў тагачаснай навуцы. Серыя нарысаў «Нарысы Віцебскай Беларусі» (1892–1899), прысвечаных сацыяльна-эканамічнаму становішчу і побытавай культуры розных груп насельніцтва Віцебшчыны.

*Тэма 24. Даследчык усходнеславянскай культуры М. А. Янчук (1859–1921)*

М. А. Янчук – адзін з ініцыятараў стварэння першага рускага этнаграфічнага часопіса «Этнографическое обозрение». Значэнне для развіцця этнаграфіі і абуджэння цікавасці да яе. «Праграма для збірання этнаграфічных звестак» (1889) пад рэдакцыяй М. Янчука. Навуковая аснова збірання этнаграфічна-фальклорных матэрыялаў. Праца «Па Мінскай губерні» (1889). Апісанне асаблівасцей антрапалогіі беларуса, звесткі пра народны побыт, звычаі, абрады, светапогляд, мову. Дакладны запіс песень з нотамі.

*Тэма 25. Жыццёвы шлях і дзейнасць М. В. Доўнар-Запольскага (1867–1934)*

Мітрафан Доўнар-Запольскі – выдатны беларускі і ўкраінскі гісторык, этнограф, грамадскі дзеяч. Яго ўнёсак у вывучэнне побыту, матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў. Каляндарна-абрадавы фальклор і шлюбная абраднасць беларусаў у працах 1888–1909 гг.: «Песні пінчукоў» (1895), «Беларускае вяселле ў культурна-рэлігійных перажытках» (1893) і інш. Канцэпцыі эвалюцыянізму. М. Доўнар-Запольскі ў БССР. Станаўленне нацыянальнай гістарыяграфіі.

*Тэма 26. Жыццёвы шлях А. К. Сержпутоўскага (1864–1940)*

Аляксандр Сержпутоўскі – выдатны беларускі этнограф, фалькларыст, мовазнаўца і публіцыст. Шлях А. Сержпутоўскага ў навуку. Нарыс – «Белорусы-палешукі» (1908): апісанне архітэктуры, побыту, звычаяў і вераванняў сялян Мазыршчыны і Случчыны. Публікацыі беларускай народнай прозы: «Сказки и рассказы белорусов-палешуков» (1911), «Казкі і апавяданні беларусаў з Слуцкага павета» (1926). Зборнік «Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў» (1930) – апісанні вераванняў, звычаяў і абрадавых практык жыхароў гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Палессе.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 27. Народазнаўчая дзейнасць Я.А. Ляцкага (1868–1942)*

Жыццёвы шлях Я. Ляцкага. Уплыў П. Шэйна на фарміраванне навуковай зацікаўленасці фальклорам. Экспедыцыі ў вёскі Барысаўскага павета. «Альхавецкія пісьмы. Барысаўскі павет» (1892). Паслядоўнае адлюстраванне асаблівасцей беларускіх гаворак. Эміграцыя даследчыка з БССР. Лёс фальклорнай калекцыі Я. Ляцкага.

*Тэма 28. Фалькларыстычная спадчына*
*А. Я. Баргдановіча (1860–1940)*

Адам Багдановіч – этнограф і фалькларыст, мемуарыст і мовазнавец. Аўтар народазнаўчых даследаванняў «Пра паншчыну» (1894) і «Перажыткі старажытнага светасузірання ў беларусаў» (1895). Карэспандэнт П. Шэйна. Публікацыя розных фальклорных жанраў у шэйнаўскіх «Матэрыялах…». Манаграфія «Перажыткі старажытнага светасузірання ў беларусаў» у гісторыі беларускай фалькларыстыкі другой паловы XIX ст. – першае спецыяльнае даследаванне светапогляду беларускага сялянства. Ідэі антрапалагічнай школы. Мемуары А. Багдановіча.

*Тэма 29. Жыццёвы шлях Я. Ф. Карскага (1861–1931).*
*Шматтомная праца «Беларусы» (1903–1922)*

Яўхім Карскі – філолаг-славіст, заснавальнік беларускага мовазнаўства і літаратуразнаўства, фалькларыст, этнограф і палеограф. Жыццёвы шлях. Роля Я. Карскага ў станаўленні нацыянальнай навукі і адукацыі. Праца «Беларусы» (т. 1–3, 1903–1922, у 7 вып.) – энцыклапедыя беларусазнаўства, вышэйшае дасягненне еўрапейскай славістыкі канца XIX – пач. XX ст. Комплекснае даследаванне асноўных жанраў і відаў беларускага фальклору. Змест тамоў выдання «Беларусы». Вып. 1 «Народная паэзія» т. 3 «Нарысы славеснасці беларускага племені», прысвечаны фальклору. Перавыданне прац Я. Карскага.

*Тэма 30. Ч. Пяткевіч (1856–1936 ) – даследчык традыцыйнай*
*культуры Беларускага Палесся*

Чэслаў Пяткевіч – польскі этнограф і фалькларыст. Уплыў Казіміра Машынскага на станаўленне даследчыцкіх інтарэсаў Ч. Пяткевіча. Узаемнае супрацоўніцтва. Кніга «Рэчыцкае



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Палессе» (1928). Падрыхтоўка пасмяротнага 4 тома «Люду беларускага» Міхала Федароўскага. «Духоўная культура Рэчыцкага Палесся: этнаграфічныя матэрыялы» (1938): багацце розных жанраў фальклору, народныя вераванні, звязаныя з жывёльным светам. Працы Ч. Пяткевіча: выключная паўната інфармацыі пра народны побыт і культуру жыхароў Рэчыцкага Палесся.

*Тэма 31. К. Машынскі (1887–1959): унёсак у развіццё славяназнаўства*

Сусветнае значэнне дзейнасці польска-беларускага этнографа, фалькларыста, мовазнаўцы Казіміра Машынскага. Манаграфія «Усходняе Палессе. Этнаграфічныя матэрыялы» (1928): адлюстраванне побыту і заняткаў жыхароў, іх духоўнай культуры (абрады, вераванні, звычаі, вусна-паэтычная творчасць) і сацыяльных норм. Праца К. Машынскага з беларускімі карэспандэнтамі. Трохтомнае выданне «Народная культура славян» (1929–1939): абагульненне звестак з усяго славянскага рэгіёна, разгляд беларускай культуры ў кантэксце агульнаславянскай. Фундаментальнасць прац К. Машынскага.

## Раздзел V. Беларуская фалькларыстыка ў XX–XXI стст.

*Тэма 32. Фальклорна-этнаграфічная праца ў Беларусі ў 1920-я гг.*

Працы збіральнікаў і даследчыкаў фальклору беларусаў – грунтоўная навуковая база, падмурак развіцця новай нацыянальнай навукі аб фальклоры. Утварэнне Інстытута беларускай культуры (1922). Інбелкульт – першая ў гісторыі Беларусі вышэйшая шматгаліновая навукова-даследчая ўстанова. Яе супрацоўнікі – выдатныя прадстаўнікі нацыянальнай інтэлігенцыі: Я. Карскі, І. Замоцін, У. Ігнатоўскі, В. Ластоўскі, Я. Лёсік, І. Луцэвіч, С. Матулайціс, К. Міцкевіч, С. Некрашэвіч, У. Пічэта, А. Смоліч, І. Сербаў. Праграма збірання помнікаў вуснай народнай творчасці А. Шлюбскага. Публікацыі 1920-х гг.: А. Сержпутоўскага «Казкі і апавяданні беларусаў з Слуцкага павета» (1926), А. Шлюбскага «Матэрыялы да вывучэння фальклору і мовы Віцебшчыны» у 2 ч. (1927–1928), М. Гарэцкага і А. Ягорава «Народныя песні з мелодыямі» (1928) і інш. Стварэнне ў 1929 г. на базе Інбелкульта Акадэміі навук БССР.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 33. Беларуская фальклярыстыка 1930-50-х гг.: уплыў савецкай ідэалогіі*

З 1930-х гг. у навуцы Беларусі пачынаецца панаванне ідэалагічнага дыктату: фальклор інтэрпрэтуецца выключна ў сістэме ідэалагічнай парадыгмы. Звужэнне метадалагічнай базы навукі. Трактоўка мастацкага метаду фальклору: сацыялістычны рэалізм і рэвалюцыйны рамантызм як вышэйшыя мастацкія каштоўнасці савецкай эстэтыкі. Народнасць фальклору як пралетарска-сялянская творчасць. Знікненне з праблемнага поля фальклярыстыкі многіх жанраў фальклору і з'яў традыцыйнай культуры. Атэізм як ідэалагічная ўстаноўка. Антырэлігійныя песні, казкі і прыказкі. Цэнзураванне твораў фальклору, якія захавалі традыцыйныя міфапаэтычныя ўяўленні. Працы М. Нікольскага «Міфалогія і абрадавасць валачобных песень» (1931), «Жывёлы ў звычаях, абрадах і вераваннях беларускага сялянства» (1933). Пераадоленне савецкіх псеўданавуковых установак у навуцы аб фальклоры з 1960-х гг.

*Тэма 34. Збіранне і вывучэнне народнай песні беларускімі савецкімі кампазітарамі*

Вялікі ўклад у збіранне і вывучэнне народнай песні і танца беларускіх кампазітараў М. Чуркіна, Р. Шырмы, Г. Цітовіча. Удзел М. Чуркіна ў экспедыцыях АН БССР. Уплыў народнага меласу на яго кампазітарскую творчасць. Зборнікі М. Чуркіна: адлюстраванне меладычных асаблівасцей і традыцыйнай спеўнай манеры. Надзвычай плённая дзейнасць у галіне беларускай фальклярыстыкі Рыгора Шырмы: збіранне песеннага фальклору, арганізацыя самадзейных фальклорных калектываў у Заходняй Беларусі. Важнейшая праца Р. Шырмы – «Беларускія народныя песні» (у 4 т., 1959–1976): багацце жанраў. Заслугі Р. Шырмы. Генадзь Цітовіч – збіральнік, даследчык і прапагандыст народнай песні. «Анталогія беларускай народнай песні» (1968). Выбраныя нарысы Г. Цітовіча «Аб беларускім песенным фальклоры» (1976).

*Тэма 35. Дзейнасць ІМЭФ АН БССР. Серыя «Беларуская народная творчасць» (БНТ)*

Стварэнне ў 1957 г. ІМЭФ АН БССР. Асноўны цэнтр фундаментальных даследаванняў у галіне фальклярыстыкі і мастацтвазнаўства. Значэнне дзейнасці акадэміка П. Глебкі. Ком-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

плекснае даследаванне традыцыйнай культуры беларусаў: збіранне, сістэматызацыя і публікацыя вусна-паэтычных твораў, даследаванне тэорыі і гісторыі беларускага фальклору, праблемы генезісу, сучасных фальклорных працэсаў. Адна з найважнейшых прац фалькларыстаў Нацыянальнай акадэміі навук з 1970 г. – шматтомнае выданне беларускай народнай творчасці (БНТ). Класіфікацыя фальклорных матэрыялаў, прадмовы, каментарыі, указальнікі.

### *Тэма 36. Развіццё беларускай этнамузыкалогіі*

Вялікая роля этнамузыкалагічных даследаванняў у развіцці беларускай фалькларыстыкі. Актывізацыя збірання і вывучэння беларускага фальклору ў 1960-я гг.: В. Ялатаў, З. Мажэйка, Л. Мухарынская, Ю. Чурко, І. Назіна, Г. Таўлай. Манаграфіі В. Ялатава: выяўленне заканамернасцей і спецыфікі развіцця беларускай музычнай песеннай творчасці. Рэгіянальныя асаблівасці народнай песні ў працах З. Мажэйкі: «Песенная культура Беларускага Палесся» (1971), «Песні Беларускага Палесся» у двух выпусках (1983–1984, Масква), «Песні Беларускага Паазер'я» (1981). Значэнне манаграфіі З. Мажэйкі «Каляндарна-песенная культура Беларусі: Вопыт сістэмна-тыпалагічнага даследавання» (1985). Працы Л. Мухарынскай, Г. Таўлай, Т. Варфаламеевай. Народная харэаграфія ў навуковых даследаваннях Ю. Чурко. Тыпалогія і функцыянальнасць народных музычных інструментаў паводле І. Назінай.

### *Тэма 37. Спадчына славутых збіральнікаў у даследаваннях беларускіх навукоўцаў*

Трохтомная гісторыя збірання і вывучэння беларускай народнай творчасці: «Беларуская фалькларыстыка. Эпоха феадалізму» (1989), «Беларуская фалькларыстыка. Збіранне і даследаванне народнай творчасці ў 60-х гг. ХІХ – пач. ХХ ст.» (1989), «Беларуская савецкая фалькларыстыка» (1987). Працы па гісторыі беларускай фалькларыстыкі і этнаграфіі В. Бандарчыка, А. Фядосіка, І. Цішчанкі, Г. Каханоўскага, Г. Пятроўскай, У. Васілевіча, Я. Саламевіча, А. Аксамітава і Л. Малаш: фалькларыстычны і гістарыяграфічны аспект. Паказ сацыяльна-гістарычных умоў развіцця навукі аб фальклоры беларусаў, сістэматызацыя звестак пра асоб збіральнікаў, характарыстыка іх сацыяльных і навуковых поглядаў, аналіз класічных збор-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нікаў. Апісанне дзейнасці ўстаноў, якія садзейнічалі збіранню, вывучэнню беларускага фальклору, навуковых таварыстваў і перыядычных выданняў, на старонках якіх на працягу XIX–XX стст. друкаваліся беларускія фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы.

*Тэма 38. Беларуская фалькларыстыка на сучасным этапе*

Даследаванне фальклору як цэласнай гісторыка-культурнай з’явы. Тэндэнцыя разгляду тэкставых комплексаў як складанай сістэмы кодаў. Распрацоўка прасторава-ландшафтнага, дэндралагічнага, астранамічнага, арніталагічнага, прадметна-рэчыўнага, саматычнага і анімалістычнага кодаў. Распаўсюджванне ідэй антрапалагічнай фалькларыстыкі. Узбагачэнне традыцыйных філалагічных і этнамузыкалагічных метадаў даследавання фальклору.

Актуальныя кірункі сучаснай навукі: антрапалагічная фалькларыстыка; інтэрпрэтацыя фальклорных тэкстаў у сістэме кодаў традыцыйнай культуры; «ніжэйшая» міфалогія, народныя вераванні і дэманалагічныя апавяданні; «народная Біблія»; школы і кірункі ў фалькларыстыцы; геаграфія фальклорных фактаў і фальклорныя дыялекты; аўдыявізуальныя метады вывучэння фальклору; арэальнае этнамузыкалагічнае вывучэнне фальклору; народныя веды пра музыку вуснай традыцыі; сістэматызацыя фальклорных фактаў, складанне генеральных і дапаможных фальклорных указальнікаў і каталогаў; трансфармацыя фальклору, постфальклор; захоўванне і публікацыя экспедыцыйных матэрыялаў; фальклор у інтэрнэт-прасторы; дзейнасць устаноў адукацыі і культуры па рэканструкцыі, адраджэнні і актуалізацыі фальклору.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

Падручнікі і вучэбныя дапаможнікі


1. *Белазаровіч, В. А.* Гістарыяграфія гісторыі Беларусі: вучэб. дапам. / В. А. Белазаровіч. – Гродна : ГрДУ, 2006. – 345 с.

2. Беларуская фалькларыстыка: Збіранне і даследаванне народнай творчасці ў 60-х гадах XIX – пачатку XX ст. / аўт. Г. А. Пятроўская, І. К. Цішчанка, У. А. Васілевіч [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – 332 с.

3. *Каханоўскі, Г. А.* Беларуская фальклрыстыка: эпоха феадалізму / Г. А. Каханоўскі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – 288 с.

4. *Фядосік, А. С.* Беларуская савецкая фальклрыстыка / А. С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1987. – 349 с.

5. *Цішчанка, І. К.* Да народных вытокаў: Збіранне і вывучэнне беларускага фальклору ў 50–60-я гады XIX ст. / І. К. Цішчанка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1986. – 247 с.

6. *Швед, І. А.* Уводзіны ў фальклрыстыку: вучэб.-метад. дапам. : у 2 ч. / І. А. Швед. – Брэст : БрДУ. – Ч. 1. – 2009. – 92 с. – Ч. 2. – 2010. – 114 с.


*Дадатковая*


1. *Аксамітаў, А. С.* З душой славяніна: Жыццё і дзейнасць З. Я. Даленгі-Хадакоўскага / А. С. Аксамітаў, Л. А. Малаш. – Мінск : Полымя, 1991. – 149 с.

2. *Бандарчык, В. К.* Беларуская этнаграфія і фальклор у працах славянскіх вучоных эпохі рамантызму / В. К. Бандарчык, Л. А. Малаш. – Мінск : Навука, 1973. – 35 с.

3. *Баршчэўскі, Я.* Выбраныя творы / Я. Баршчэўскі. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 1998. – 480 с.

4. Белорусская этномузыкология : Очерки истории (XIX–XX вв.) / под ред. З. Можейко ; Белорус. респ. фонд фундам. исслед. – Минск : Тэхналогія, 1997. – 254 с.

5. *Васілевіч, У. А.* Збіральнікі / У. А. Васілевіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 189 с.

6. *Володина, Т. В.* Успехи и болевые точки белорусской фольклористики последних лет / Т. В. Володина // Навстречу Третьему Всероссийскому конгрессу фольклористов : сб. науч. ст. – М. : Гос. респ. центр русского фольклора, 2013. – С. 79–98.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*7. Далэнга-Хадакоўскі, З.* Выбранае / З. Далэнга-Хадакоўскі ; уклад., прадм., пер. с пол. тэкстаў Л. Малаш ; камент. Л. Малаш, К. Цвіркі. – Мінск : Кнігазбор, 2007. – 444 с.

*8.* Даследчык гісторыі трох народаў: М. В. Доўнар-Запольскі : зб. навук. арт. і дак. / пад рэд. В. М. Лебедзевай. – Гомель–Рэчыца : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2000. – 293 с.

9. Інстытут беларускай культуры / рэдкал.: М. А. Барысевіч [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 254 с.

*10. Карскі, Я. Ф.* Беларусы / Я. Ф. Карскі. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 2001. – 637 с.

*11. Каханоўскі, Г. А.* Руплівец нашай старасветчыны: Яўстах Тышкевіч / Г. А. Каханоўскі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 63 с.

*12. Літвіновіч, А.* Традыцыйная культура беларусаў у польскай перыёдыцы другой паловы XIX – пачатку XX ст. : вучэб. дапам. для студэнтаў філал. фак. спецыяльнасці 1-21 05 01 «Беларус. філалогія» і 1-21 05 04 «Слав. філалогія» / А. Ф. Літвіновіч. – Мінск : БДУ, 2005. – 162 с.

*13. Костюковец, Л. Ф.* Фольклоризация канта / Л. Ф. Костюковец. – Минск : РИВШ, 2014. – 178 с.

*14. Машынскі, К.* Усходняе Палессе / Казімір Машынскі ; уклад., прадм., камент. У. Васілевіча; пер. Л. Салавей. – Мінск : Беларус. навука, 2014. – 528 с.

*15.* Навуковая спадчына Яўстафія Тышкевіча (да 200-годдзя з дня нараджэння) : матэрыялы Міжнар. навук. канф., 18 крас. 2014 г., г. Лагойск / уклад. А. Г. Алфёрава [і інш.] ; рэдкал.: А. І. Лакотка [і інш.] ; ЦДБКМЛ НАН Беларусі, НАН Беларусі. – Мінск : Права і эканоміка, 2014. – 181 с.

*16. Новиков, Н. В.* Павел Васильевич Шейн: книга о собирателе и издателе русского и белорусского фольклора / Н. В. Новиков. – Минск : Выш. шк., 1972. – 223 с.

*17. Петровская, Г. А.* Не погасла звезда : жизненный и творческий путь Н. А. Янчука / Г. А. Петровская; АН БССР, ИМЭФ. – Минск : Наука и техника, 1987. – 78 с.

*18. Порецкий, Я. И.* Соломон Рысинский : Solomo Pantherus Leucorussus (конец XVI – начало XVII в.) / Я. И. Порецкий. – Минск : Изд-во БГУ, 1983. – 158 с.

*19. Пширков, Ю. С.* А. Е. Богданович / Ю. С. Пширков. – Минск : Наука и техника, 1966. – 128 с.

*20. Пяткевіч, Ч.* Рэчыцкае Палессе : пер. з пол. / Часлаў Пяткевіч ; уклад., прадм. У. Васілевіча. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 2004. – 670 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

21. *Пятроўская, Г. А.* Пачынальнік беларускага народазнаўства М. Я. Нікіфароўскі / Г. А. Пятроўская. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 72 с.

22. *Саламевіч, І. У.* Міхал Федароўскі / І. У. Саламевіч. – Мінск : Выш. шк., 1972. – 384 с.

23. *Сербаў, І. А.* Вічынскія паляне : матэр. культура : этнагр. нарыс Беларус. Палесся / І. А. Сербаў ; прадм. Т. А. Навагродскі, Я. А. Пясоцкая. – Мінск : Беларус. фонд культуры, 2005. – 78 с.

24. *Сержпутоўскі, А. К.* Казкі і апавяданні беларусаў Слуцкага павета / А. К. Сержпутоўскі. – Мінск : Універсітэцкае, 2000. – 270 с.

25. Сравнительный указатель сюжетов: Восточнославянская сказка / АН СССР ; сост.: Л. Г. Бараг, И. П. Березовский, К. П. Кабашников, Н. В. Новиков. – Л. : Наука, 1979. – 437 с.

26. *Толстой, Н. И.* О предмете этнолингвистики и ее роли в изучении языка и этноса / Н. И. Толстой // Ареальные исследования в языкознаии и этнографии (Язык и этнос). – Л. : Наука, 1983. – С. 181–190.

27. *Улащик, Н. Н.* Очерки по археографии и источниковедению истории Белоруссии феодального периода / Н. Н. Улащик. – М. : Наука, 1973. – 303 с.

28. Фальклор у запісах Яна Чачота і братоў Тышкевічаў / НАН Беларусі, ІМЭФ ; рэдкал.: А. С. Фядосік [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2005. – 328 с.

29. *Фядосік, А. С.* Ілюзорнасць і сапраўднасць: «Белыя плямы» ў гісторыі фалькларыстыкі 20–30-х гг. / А. С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 75 с.

30. *Фядосік, А. С.* Прынцыпы класіфікацыі і выдання фальклорных твораў у шматтомным зводзе беларускай народнай творчасці ў параўнальным супастаўленні са зводамі іншых славянскіх народаў : даклады / АН БССР, Беларус. кам. славістаў / А. С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983. – 44 с.

31. *Цвірка, К. А.* Слова пра Сыракомлю: Быт і культура беларусаў у творчасці «вясковага лірніка» / К. А. Цвірка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1975. – 199 с.

32. *Шырма, Р. Р.* Песня – душа народа : З літ. спадчыны / Р. Р. Шырма ; уклад., камент. і бібліягр. В. Ліцвінкі ; прадм. Н. Гілевіча. – Мінск : Мастац. літ., 1993. – 348 с.

33. *Якіменка, Т. С.* Сучасная беларуская этнамузыкалогія (да практык апошняй трэці XX – пачатку XXI стагоддзя) / Т. С. Якіменка. – Мінск: Тэхналогія, 2004. – 283 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі вынікаў навучальнай дзейнасці студэнтаў

Для дыягностыкі кампетэнцыі студэнтаў і кантролю якасці адукацыі па дысцыпліне «Гісторыя беларускай фалькларыстыкі» прадугледжана выкарыстанне наступных сродкаў:

– вуснае апытанне на семінарскіх занятках;

– праверка заданняў для кантралюемай самастойнай работы;

– праверка пісьмовых заданняў (рэфератаў, эсэ) па асобных тэмах.

## Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў

Самастойная работа студэнтаў адбываецца на базе Нацыянальнай бібліятэкі, у фондах якой студэнты

– знаёмяцца з манаграфіямі, асобнымі даследаваннямі і фальклорна-этнаграфічнымі зборнікамі XIX–XX стст.;

– вывучаюць характар публікацый празаічных і песенных жанраў фальклору ў зборніках XIX ст.;

– выконваюць навукова-даследчую работу для ўдзелу ў студэнцкіх канферэнцыях;

– рыхтуюць навукова-папулярныя паведамленні да юбілеяў і памятных дат.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ФАЛЬКЛАРЫСТЫКІ**

*Вучэбная праграма*
*ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне*
*для спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць*
*(па напрамках), напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-05 Народная творчасць (фальклор),*
*спецыялізацыі 1-18 01 01-05 01 Этнафоназнаўства*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2015. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,51. Ул.-выд. арк. 1,07. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ